


# Гродзенскі Універсітэт

ГАЗЕТА ГРОДЗЕНСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ ЯНКІ КУПАЛЫ

Выдаецца з 1986 года ● *№ 3 (275)* ● *3 красавіка 2000 года, панядзелак*

Выходзіць адзін раз на месяц ● Распаўсюджваецца бясплатна


*ГРОДЗЕНСКАМУ ДЗЯРЖАЎНАМУ УНІВЕРСІТЭТУ ІМЯ ЯНКІ КУПАЛЫ – 60*

## МЫ — НЕ ПОБАЧ З ЕЎРОПАЙ. МЫ — У ЯЕ ЦЭНТРЫ



**У сувязі са святкаваннем юбілею на адрас калектыву універсітэта паступіла 83 афіцыйных віншаванні ад устаноў, арганізацый. Больш за 40 фірмаў, прадпрыемстваў разам з віншаваннямі аказалі універсітэту спонсарскую дапамогу.**

**Рэпартаж аб святкаванні юбілею чытайце на 3-7 старонках газеты.**

### КАЛЕКТЫВУ ГРОДЗЕНСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ ЯНКІ КУПАЛЫ

Паважаныя выкладчыкі, навуковыя супрацоўнікі, аспіранты і студэнты!

Сардэчна віншую вас з 60-годдзем Гродзенскага дзяржаўнага універсітэта імя Янкі Купалы.

Прыемна ўсведамляць, што за невялікі гістарычны перыяд ваша ўстанова ператварылася ў аўтарытэтны адукацыйны, навуковы і культурны цэнтр, у якім авалодваюць ведамі і навыкамі каля 10 тысяч студэнтаў і аспірантаў, а вучэбна-выхаваўчы працэс забяспечваюць 1300 педагогаў, вучоных і супрацоўнікаў. Калектывам набыты цікавы вопыт навучання па новых спецыяльнасцях з улікам патрэбнасцей рынку працы, прадпрыемстваў і арганізацый вобласці. Універсітэт уносіць важкі ўклад у развіццё міжнароднага супрацоўніцтва ў сферы навукі і адукацыі.

У цэнтры ўвагі педагагічнага калектыву і надалей павінны быць праблемы асваення і ўкаранення сучасных тэхналогій навучання, удасканальвання структуры, павышэння якасці прафесійнай падрыхтоўкі і грамадзянскага выхавання спецыялістаў. Зразумела, у сумесным пошуку больш эфектыўных метадаў і сродкаў вырашэння гэтых праблем непазбежны плюралізм поглядаў і інавацыйных падыходаў. Аднак прынцыпова важна, каб укараняемыя новаўвядзенні былі карысныя для грамадства і дзяржавы: умацоўвалі прэстыж нацыянальнай сістэмы адукацыі і адпавядалі прагрэсіўным тэндэнцыям развіцця сусветнай вышэйшай школы.

Жадаю вам здароўя, шчасця, дабрабыту і новых творчых поспехаў на ніве адукацыі і навукі.

**Аляксандр ЛУКАШЭНКА.**
**4 сакавіка 2000 года**

### ГАНАРОВАЯ ГРАМАТА

**Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь**

**УЗНАГАРОДЖВАЕ**

калектыў Гродзенскага дзяржаўнага універсітэта імя Янкі Купалы за шматгадовую плённую працу па падрыхтоўцы высокакваліфікаваных спецыялістаў і навуковых кадраў і ў сувязі з 60-годдзем з дня заснавання навучальнай установы.

**Люты 2000 года.** **Міністр В.І.СТРАЖАЎ.**

### КАЛЕКТЫВУ ГРОДЗЕНСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ ЯНКІ КУПАЛЫ

Паважаныя навукоўцы, выкладчыкі, работнікі сістэмы адукацыі!

Прыміце мае сардэчныя віншаванні з нагоды 60-годдзя вашай навучальнай установы. Ваш універсітэт стаў цэнтрам навукі, адукацыі і культуры не толькі ў Гродне, але і ў Заходнебеларускім рэгіёне. Шмат знакамітых людзей атрымалі пуцёўку ў жыццё ў сценах Гродзенскага педінстытута, а пасля — і універсітэта. І сёння вы працягваеце слаўныя традыцыі вашага калектыву па падрыхтоўцы высокаадукаваных спецыялістаў, якія заклікаНы прысвяціць свае веды і намаганні далейшаму сацыяльна-эканамічнаму развіццю рэгіёну, росквіту роднай краіны.

Выказваю ўпэўненасць, што вашы багатыя веды і вопыт, вашы шматгадовыя напрацоўкі ў справе падрыхтоўкі кадраў і далей будуць служыць справе развіцця рэгіёну, павышэнню адукацыйнага і культурнага ўзроўню беларускага народа.

У сувязі з юбілеем жадаю вам, шаноўныя, моцнага здароўя, шчасця, дабрабыту і плёну ў вашай нялёгкай справе на карысць Айчыны. Жадаю сённяшнім студэнтам, аспірантам, магістрантам стаць сапраўднымі спецыялістамі. Краіна чакае вас!

**Намеснік прэм'ер-міністра Рэспублікі Беларусь У.П. ЗАМЯТАЛІН.**

### КОЛЛЕКТИВУ ГРОДНЕНСКОГО ГОСУДАРСТВЕННОГО УНИВЕРСИТЕТА ИМЕНИ ЯНКИ КУПАЛЫ

Уважаемые преподаватели, ученые, аспиранты, студенты, сотрудники университета!

Примите искренние поздравления по случаю 60-летия со дня создания Вашего учебного заведения.

Созданный накануне Великой Отечественной войны пединститут, а позже университет, прошел большой и славный путь. Сегодня Гродненский государственный университет, которому дано имя великого сына Беларуси Янки Купалы, представляет собой крупнейший региональный центр науки, образования и культуры, осуществляет фундаментальную подготовку специалистов более чем по тридцати специальностям, обеспечивает педагогическими кадрами область и республику. Ваши выпускники сегодня — руководители органов государственного управления, образования, деятели культуры, известные ученые и педагоги. Учебно-воспитательную и научно-исследовательскую работу осуществляет высокопрофессиональный коллектив ученых и преподавателей, большая часть из которых сами являются выпускниками Вашего прославленного ВУЗа.

О значительном международном авторитете Гродненского университета свидетельствуют тесные связи с научными центрами Европы и Америки, проведение многочисленных международных научно-практических конференций, участие в реализации ряда международных программ. Кроме того, университет ежегодно готовит десятки специалистов для иностранных государств.

От всей души благодарим коллектив университета за многолетнюю плодотворную работу и выражаем уверенность и надежду, что и в дальнейшем ему будут свойственны новаторский поиск и самоотверженность в служении гуманному делу образования и воспитания.

Желаем Вам дальнейших творческих успехов, целенаправленности в работе, здоровья и большого личного счастья.

**ГРОДНЕНСКИЙ ОБЛАСТНОЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ.**
**ГРОДНЕНСКИЙ ОБЛАСТНОЙ СОВЕТ ДЕПУТАТОВ.**
**3 марта 2000 года**

**ВІНШАВАННЕ**

**4 сакавіка 2000 года.**
**г. Мінск**

**ШАНОЎНЫЯ СЯБРЫ!**

Прыміце нашы сардэчныя віншаванні з выпадку 60-годдзя з дня ўтварэння універсітэта — цэнтра навукі, адукацыі і культуры Заходняга рэгіёну Рэспублікі Беларусь.

У гэты ўрачысты дзень жадаем прафесарска-выкладчыцкаму саставу, студэнтам і выпускнікам універсітэта, іх родным і блізкім моцнага здароўя, вялікага асабістага шчасця, значных творчых дасягненняў, новых поспехаў і перамог.

Выказваем спадзяванне на далейшае плённае супрацоўніцтва ў галіне падрыхтоўкі і атэстацыі навуковых і навукова-педагагічных кадраў вышэйшай кваліфікацыі.

**Старшыня ВАК Беларусі**
**А.П.ДАСТАНКА.**

**ГАНАРОВАЯ ГРАМАТА**
**№ 38**

Дзяржаўны камітэт па справах рэлігій і нацыянальнасцей Рэспублікі Беларусь узнагароджвае Гродзенскі дзяржаўны універсітэт імя Янкі Купалы за вялікі ўклад у справу выхавання моладзі на прынцыпах агульначалавечых маральных каштоўнасцей і ў сувязі з 60-гадовым юбілеем.

**Старшыня камітэта**
**А.М.БІЛЫК.**
**4 сакавіка 2000 года**
**г. Мінск**

**ГАНАРОВАЯ ГРАМАТА**

**Дзяржаўны камітэт на навуцы і тэхналогіях Рэспублікі Беларусь**
**УЗНАГАРОДЖВАЕ**

калектыў Гродзенскага дзяржаўнага універсітэта імя Янкі Купалы за вялікі ўклад у развіццё фундаментальных і прыкладных навуковых даследаванняў, выкананне дзяржаўных навукова-тэхнічных праграм і інавацыйных праектаў, падрыхтоўку высокакваліфікаваных спецыялістаў і навуковых кадраў, і ў сувязі з шасцідзесяцігоддзем з дня заснавання.

**Старшыня В.А.ГАЙСЁНАК.**

## ВІНШАВАЛЬНАЯ ПАШТОЎКА

**Рэктарат, прафком, савет ветэранаў віншуюць з юбілеем і жадаюць моцнага здароўя, шчасця, дабрабыту, поспехаў юбілярам. Нагадваем, калі і каго можна павіншаваць.**

❄ 6 красавіка — **Раісу Міхайлаўну ТАРЫМУ** — каменданта навучальнага корпуса №3.

❄ 7 красавіка — **Барыса Іванавіча ЕЎТУШЭНКУ** — рабочага навучальнага корпуса №5.

❄ 8 красавіка — **Ларысу Паўлаўну ГОЙ** — каменданта навучальнага корпуса №1.

❄ 24 красавіка — **Генрыха Генрыхавіча БЕКІША** — старшага выкладчыка кафедры спартыўных гульняў.

❄ 29 красавіка — **Івана Эдуардавіча ШАРКО** — старшага выкладчыка кафедры фізвыхавання.

❄ 29 красавіка — **Сяргея Леанідавіча ШЫБАЛОЎСКАГА** — рабочага.

*ПОСТАЦІ ВНУ*

# СОРАК ДВА ГАДЫ РАБОТЫ ЦЫЛІ ГАФМЕКЛЕР

**Віктар ТАРАНЦЕЙ,**
**прафесар**



**Цыля Маісееўна Гафмеклер (нар. у 1922 г.) паходзіла з сям'і рабочых друкароў г. Гомеля. Вучылася на літфаку Мінскага педінстытута імя М. Горкага (1940-41 гг.). Была вучаніцай бухгалтэрыі спецгандлю НКВД г. Сталінабада Таджыкскай ССР (1942-43 гг.), калькулятарам сталоўкі (1943-44 г.), тэхнічным бухгалтарам (1944-45 гг.), ст. бухгалтарам аблкартбюро г. Гродна. З лютага 1948 года — ст. бухгалтар, галоўны бухгалтар Гродзенскага педінстытута і універсітэта. З 1990 г. — на пенсіі.**

**Узнагароджана Граматай Гродзенскага гарвыканкома і гаркома партыі (1958 г.), Ганаровай Граматай Міністэрства асветы БССР (1965, 1976 гг). Памерла ў 1996 г.**

Вядома, што галоўнай фігурай у ВНУ з'яўляецца выкладчык. Але працу калектыву забяспечваюць шматлікія службы і падраздзяленні, сярод якіх цэнтральнае месца займае бухгалтэрыя. Тут павінны працаваць кампетэнтныя і дасведчыя спецыялісты, прынцыповыя, чыстыя «на руку» людзі.

Такім спецыялістам была Цыля Гафмеклер, галоўны бухгалтар універсітэта. Мяняліся рэктары і дэканы, загадчыкі кафедраў і служб, а гэтая невялічкага росту жанчына ўпарта цягнула свой працоўны воз.

Цылю Маісееўну паважалі за выдатнае веданне справы. Не адзін раз па тэлефоне ў яе кансультаваліся работнікі міністэрства. Нават чарговы рэктар не мог прыкрыкнуць на Цылю Гафмеклер. Яна бы гэтага не дазволіла. За прафесіяналізм ёй аб'яўлены шэраг падзяк. У 1975 годзе міністр асабіста адзначыў Цылю Гафмеклер за добрасумленнае выкананне даручэнняў па пытаннях падрыхтоўкі семінара бухгалтараў і разліковых работнікаў Міністэрства асветы БССР.

Любоў да працы, адданасць ёй былі сэнсам жыцця Цылі Гафмеклер. Застаўшыся на ўсё жыццё без сям'і, большую частку свайго часу Цыля Гафмеклер праводзіла на працоўным месцы. «Старажылы універсітэта» сведчаць, што ў маладосці ў яе было яркае каханне з будучым дацэнтам Леанідам Лінёвым. Лінёў быў частым госцем у сям'і Маісея Рыгоравіча Гафмеклера, тады дырэктара літаграфіі ў Гродне. Але штосьці ў іх не склалася, Цыля не любіла апавядаць аб асабістым жыцці. Толькі аднойчы заўважыла, што цяжка жыць пасля таго, як любімы чалавек табе здрадзіць.

Не будучы здаровым чалавекам (страшэнна балелі ногі) яна ездзіла на працу нават на таксі.

Статус галоўнага бухгалтара ў тыя часы быў вышэйшым, чым цяпер, бо ён прызначаўся міністэрствам (цяпер — рэктарам). Нават персанальная машына выдзялялася для рэктара і галоўнага бухгалтара.

Не адзін год Цыля Гафмеклер заставалася без адпачынку, бо гэтага патрабавалі справы, або прыязджала чарговая праверка. У тыя часы камісіі любілі ездзіць у правінцыяльныя ВНУ, дзе іх добра прымалі і частавалі. Бывала так, што за стол члены камісіі садзіліся толькі тады, калі зыходзіліся канцы з канцамі ў фінансах. Але ў Цылі Гафмеклер канцы зыходзіліся заўсёды, хаця аб'ёмы і складанасць працы раслі.

Цыля прайшла шлях ад прымітыўных лічыльнікаў да камп'ютара з годнасцю.

*«Цыля Гафмеклер мяне многаму навучыла. Яна выдатна разбіралася ў людзях. Па знешнему выгляду і выніках невялікай размовы яна беспамылкова вызначала кваліфікацыю спецыяліста.*

*Бухгалтараў не прынята тады было хваліць, хаця праца іх была вызначальнай для ВНУ».*

**Фаіна ПАЗНЯК,**
**нам. галоўнага бухгалтара універсітэта.**

*«Цыля Гафмеклер прыняла мяне на працу касірам, але, як кажуць, «без грошай». Умела навучыць людзей працаваць кампетэнтна, патрабаваць аднаведнай аддачы на працы. Я заўсёды мела падтрымку ад Цылі Маісееўны».*

**Таісія ЧМЕЛЬ,**
**ст. бухгалтар.**

*ГРОДЗЕНСКАМУ ДЗЯРЖАЎНАМУ УНІВЕРСІТЭТУ ІМЯ ЯНКІ КУПАЛЫ — 60*

# МЫ — НЕ ПОБАЧ З ЕЎРОПАЙ. МЫ — У ЯЕ ЦЭНТРЫ

## НАТАТКІ З ПАШЫРАНАГА ПАСЯДЖЭННЯ САВЕТА УНІВЕРСІТЭТА АД 3 САКАВІКА 2000 ГОДА

У загаловак да расказу аб урачыстым святкаванні 60-годдзя ГрДУ невыпадкова вынесены словы рэктара універсітэта, прафесара С.А.Маскевіча, сказаныя ім у перадачы БТ «Сёння з вамі...». Так, тое новае, сучаснае, што ёсць ва універсітэце, што з'яўляецца ў нашым паўсядзённым жыцці — у вучобе, рабоце — нясе лёгкі налёт еўрапейскай элегантнасці. І не толькі. Шануюцца добрыя старыя традыцыі. А гэта — і павага да мінулага, да гісторыі, да людзей, якія яе стваралі, гэта і цеснае супрацоўніцтва і цёплыя сустрэчы з гасцямі — калегамі з іншых вышэйшых установаў, выпускнікамі, кіраўнікамі мясцовых прамысловых прадпрыемстваў, гаспадарак. Урачыстасці, прысвечаныя юбілею, прайшлі так ярка і незабыўна, як доўгачаканая сустрэча сяброў, калег, родных і блізкіх па духу людзей.

Варта сказаць, што ўпершыню ўрачыстасці пачаліся з гімна універсітэта, які быў напісаны спецыяльна да юбілейнай даты, і прагучаў у выкананні хора.

> **ЕСТЬ МНЕНИЕ!**
> **В.РУСАКЕВИЧ, первый заместитель главы администрации Президента РБ:**
> Тридцать лет назад я закончил биолого-химический факультет Гродненского пединститута. Я горжусь этим, потому что здесь я получил прекрасное образование...

Ва ўрачыстым пасяджэнні Савета універсітэта, якое адбылося 3 сакавіка, прынялі ўдзел не толькі члены Савета, як гэта вядзецца традыцыйна. У зале — госці: выпускнікі, прадстаўнікі аблвыканкома, прадпрыемстваў і арганізацый, ветэраны ВНУ, дэлегацыі з Рэспублікі Польшча, Латвіі, Злучаных Штатаў Амерыкі. Адкрываючы ўрачыстае пасяджэнне, рэктар універсітэта, прафесар С.А.Маскевіч прадставіў гасцей прысутным. У зале ўсталявалася цёплая душэўная атмасфера. На адным



дыханні слухалі члены Савета і госці універсітэта даклад рэктара, у якім былі закрануты асноўныя вехі гісторыі універсітэта, акрэслены перспектывы яго развіцця.

— Калектыў універсітэта, адзначаючы сваё шасцідзесяцігоддзе, — сказаў С.А.Маскевіч, — разважае над тым, якой павінна быць навучальная ўстанова ў новым стагоддзі, што трэба зрабіць, каб сённяшні студэнт стаў паўнапраўным, падрыхтаваным членам грамадства высокіх тэхналогій і інфармацыйных сістэм.

Нам пашчасціла адзначаць юбілей нашай навучальнай установы на сумежжы двух вякоў. Гэта знамянальна. Чалавецтва развітваецца з XX стагоддзем, бурным, супярэчлівым і адначасова багатым на чалавечы інтэлект, і крочыць у эпоху панавання касмічнага розуму з імкненнем дамагчыся большага на новых скрыжалях гісторыі.

Адначасова для нас сёння ёсць грунтоўная падстава праналізаваць пройдзенае. Мы памятаем і шануем сваю гісторыю. Без яе няма сапраўднага сёння і, я ўпэўнены, не будзе належнага заўтра.

Гродзенскі дзяржаўны універсітэт імя Янкі Купалы сёння — буйны адукацыйны і навуковы цэнтр рэгіёну. Ён бярэ свой пачатак з настаўніцкага інстытута, створанага ў 1940 годзе. Гэта была вялікая падзея ў нашай з вамі гісторыі, — працягваў дакладчык. — На двух факультэтах інстытута — беларускай і рускай мовы і літаратуры, а таксама фізіка-матэматычным — рыхтаваліся настаўнікі 5-7-х класаў няпоўнай сярэдняй школы. Тэрмін навучання складаў два гады. Заняткі пачаліся 7 сакавіка 1940 года. Першыя студэнты — 360 юнакоў і дзяўчат, пераважна дзеці мясцовых рабочых і сялян, запоўнілі аўдыторыі асноўнага навучальнага корпуса, пабудаванага яшчэ ў 1894 годзе для Марыінскай жаночай гімназіі.

Гэты першы крок у станаўленні вышэйшай школы ў Заходнебеларускім краі быў перарваны Вялікай Айчыннай вайной. Пасля вызвалення

> **ЕСТЬ МНЕНИЕ!**
> **Джон ТОМАС, профессор университета Баффало, США:**
> Мой визит в Гродно совпал с вашим юбилеем, и это добрый знак того, что наш совместный проект будет успешным. В третьем тысячелетии мы будем сотрудничать. Вы поступаете правильно, укрепляя связи с местным руководством, промышленностью и бизнесом. У вашего университета — большое будущее.

Гродзеншчыны ад фашысцкай акупацыі, калі яшчэ працягвалася вайна, пачалося аднаўленне інстытута. Але ўжо ў новай якасці. На падставе Пастановы Савета Народных Камісараў СССР ад 20 кастрычніка 1944 г. Гродзенскі настаўніцкі інстытут быў пераўтвораны ў педагагічны.

У 1944/45 навучальным годзе навукова-педагагічны штат інстытута налічваў 6 старшых выкладчыкаў, 4 асістэнты і выкладчыкі. Па сумяшчальніцтве працавалі 10 выкладчыкаў, сярод якіх 3 кандыдаты навук. У наступным, 1945/46 навучальным годзе, з 24 штатных выкладчыкаў толькі 1 меў вучоную ступень кандыдата навук. Зразумела, што аб якой-небудзь значнай навуковай дзейнасці не магло быць і гаворкі. Асноўная дзейнасць выкладчыкаў была на-



кіравана на навучальна-выхаваўчы працэс.

Пачаткам развіцця навукова-даследчай работы з'яўляецца другая палова 50-х гадоў. У гэты час узмацняецца прафесійная падрыхтоўка студэнтаў, паглыбляюцца змест і тэматычная накіраванасць іх навучання і ўсталёўваецца шчыльная сувязь навучальнай і навуковай работы. Значным паказчыкам навуковага развіцця інстытута таго часу з'яўляецца рост навукова-педагагічнай кваліфікацыі выкладчыкаў. Так, у перыяд з 1949 па 1959 гады колькасць кандыдатаў навук змянілася з 9 да 19 чалавек. Але іх удзельная вага ў агульнай колькасці навукова-педагагічнага персаналу інстытута, які складаў 67 чалавек, была невысокай — 28%.

Асноўнымі навуковымі кірункамі ў інстытуце ў 50-я гады з'яўляліся даследаванні гісторыі савецкага грамадства, гісторыі савецкай агульнаадукацыйнай школы, гісторыі атэізму, гісторыі педагагічнай адукацыі, распрацоўка методыкі выкладання матэматыкі,

# МЫ — НЕ ПОБАЧ З ЕЎРОПАЙ

навуковы аналіз творчасці пісьменнікаў і інш.

Усяго на працягу 15 гадоў з 1945 г. выкладчыкамі інстытута было абаронена 22 (дваццаць дзве) кандыдацкія дысертацыі, выдадзена 7 зборнікаў "Научных записок", 5



манаграфій, больш за 150 навуковых артыкулаў. Навукова-даследчая праца служыла надзейным сродкам павышэння ўзроўню метадалагічнай і метадычнай дзейнасці выкладчыкаў, садзейнічала падрыхтоўцы навукова-педагагічных кадраў.

20 лістапада 1969 года ў інстытуце была адкрыта аспірантура, што дало магчымасць падрыхтоўкі кадраў вышэйшай кваліфікацыі па спецыяльнасцях "Матэматычны аналіз", "Дыферэнцыяльныя і інтэгральныя ўраўненні", "Гісторыя СССР", "Беларуская мова".

На пачатку 70-х гадоў Гродзенскі дзяржаўны педагагічны інстытут становіцца не толькі цэнтрам падрыхтоўкі настаўніцкіх кадраў, але і навуковых даследаванняў і распрацовак, звязаных у першую чаргу з патрэбамі школы і народнай асветы. У той час у інстытуце налічвалася ўжо 3 доктары і 62 кандыдаты навук, працавала 21 кафедра.

Шырокае развіццё навукова-даследчай работы пачынаецца з моманту пераўтварэння 1 мая 1978 года Гродзенскага дзяржаўнага педагагічнага інстытута ва універсітэт. Адкрыццё універсітэта прывяло да значнага павышэння навуковага патэнцыялу. На момант стварэння універсітэта ў яго структуры было пяць факультэтаў: матэматычны, фізічны, гістарычны, філалагічны і факультэт педагогікі і методыкі пачатковага навучання. Дзейнічала 25 кафедраў і курс грамадзянскай абароны. З 1 верасня 1978 года пачалі працаваць дзве новыя кафедры: дыферэнцыяльных ураўненняў, а таксама дзяржавы і права.



Значна пашырыліся сувязі універсітэта з навуковымі цэнтрамі СССР і рэспублікі. Так, фізікі распрацоўвалі шэраг тэмаў сумесна з Інстытутам фізікі і Інстытутам электронікі АН БССР, гісторыкі — з Інстытутам гісторыі АН БССР, матэматыкі — з Інстытутам матэматыкі АН БССР і кафедрай матэматычнага аналізу БДУ імя Леніна. Зроблены першыя крокі па ўсталяванні сувязяў з Інстытутам мовазнаўства імя Якуба Коласа і Інстытутам літаратуры імя Янкі Купалы АН БССР. Развіваюцца сувязі з вучонымі філіяла Варшаўскага універсітэта ў г.Беластоку.

З 1978 года універсітэт атрымаў права выдавецкай дзейнасці. Гэта палепшыла становішча з публікацыяй вынікаў навукова-даследчай працы. Значны рост гаспадарча-разліковых работ выклікаў неабходнасць стварэння ва універсітэце навукова-даследчага сектара, што адбылося 1 мая 1979 г.

У 1978 годзе пры гістарычным факультэце было адкрыта аддзяленне правазнаўства. Праз тры гады аднавіў сваю работу факультэт біялогіі і хіміі. З 1985 г. пачаў функцыянаваць факультэт педагогікі і



методыкі пачатковага навучання. У 1988/89 навучальным годзе на сямі факультэтах займаліся ўжо 4312 студэнтаў. У тым ліку 2250 студэнтаў стацыянарнага навучання, 1750 — завочнага і 312 — вячэрняга. Універсітэт рыхтаваў кадры па 9 спецыяльнасцях і 16 спецыялізацыях. З 1989 г. быў адкрыты факультэт фізічнага выхавання.

У 1990 г. з складу фізічнага факультэта вылучылася яго вытворчае крыло ў самастойны інжынерны факультэт. У 1991 г. ва універсітэце адкрываецца факультэт беларускай філалогіі і культуры. У тым жа годзе быў пераўтвораны гістарычны факультэт. У 1993 г. упершыню быў праведзены набор на аддзяленне міжнародных эканамічных адносін пры факультэце правазнаўства. У 1994 г. на філалагічным факультэце адкрылася аддзяленне замежных моваў (англійскай, нямецкай і французскай).

У 1997 г. факультэт права і эканомікі быў рэарганізаваны ў юрыдычны факультэт і факультэт эканомікі і кіравання, а факультэт замежных моваў на правах аддзялення ўвайшоў у склад філалагічнага факультэта. У сакавіку 1998 г. на базе універсітэта створаны інстытут павышэння кваліфікацыі і

**ЕСТЬ МНЕНИЕ!**

**Н. ХАРУК, начальник ВЦ:**

Праздник, который охватил буквально все и всех — так я могу охарактеризовать юбилейные торжества. Возможно, мелкие недочеты и несогласованность имели место, но в целом юбилей прошел здорово. Каждый в меру своих сил и возможностей старался что-то сделать для того, чтобы праздник удался. Проявились лучшие человеческие качества сотрудников университета, произошла невидимая на первый взгляд консолидация коллектива...

**ЕСТЬ МНЕНИЕ!**

**Адам ЯМРОЗ, профессор университета Белостока:**

Мы сегодня подписали договор о сотрудничестве, и, я надеюсь, оно будет успешным. Условия у нас, как у партнеров, близкие — два славянских университета, работающих в одном направлении. Я рад за вас, много положительного здесь, и я хотел бы, чтобы у нас университет был, как в Гродно.

# МЫ — У ЯЕ ЦЭНТРЫ



перападрыхтоўкі кадраў. У студзені 1999 г. пры Гродзенскім дзяржаўным універсітэце пачало працаваць аб'яднанне кафедраў сацыяльна-гуманітарных дысцыплін.

Сёння Гродзенскі дзяржаўны універсітэт імя Янкі Купалы — гэта універсітэт класічнага тыпу, які ажыццяўляе адукацыйную, навуковую і культурную палітыку ў нашым рэгіёне.

У складзе яго — 10 факультэтаў і Інстытут павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кіруючых работнікаў і спецыялістаў, 64 кафедры, 5 навукова-даследчых лабараторый, цэнтр сацыялагічных даследаванняў і іншыя структуры. Агульная колькасць штатных супрацоўнікаў універсітэта, занятых навукова-даследчай дзейнасцю, складае 647 чалавек.

Студэнты універсітэта маюць магчымасць атрымаць вышэйшую адукацыю як з адрывам, так і без адрыву ад вытворчасці па бюджэтнай і дагаворнай формах навучання. Па стане на люты 2000 года ва універсітэце навучаюцца 9377 чалавек, з іх на дзённай форме навучання — 6046 студэнтаў, на вячэрняй — 78, на завочнай форме навучання — 3253.

Неабходна адзначыць шырокі спектр спецыяльнасцей, спецыялізацый і дадатковых спецыяльнасцей, па якіх вядзецца навучанне ў Гродзенскім дзяржаўным універсітэце імя Янкі Купалы. На дзённай форме навучання ажыццяўляецца падрыхтоўка па 31 спецыяльнасці, пад гэтыя спецыяльнасці адкрыта звыш сотні спецыялізацый. Па 11 асноўных спецыяльнасцях студэнты атрымліваюць дадатковую спецыяльнасць. На вячэрняй і завочнай формах навучання студэнты навучаюцца па 21 спецыяльнасці. У гэтым годзе ва універсітэце плануецца аб'явіць набор на першы курс па 42 спецыяльнасцях.

1999/2000 навучальны год дастаткова знамянальны для Гродзенскага універсітэта, паколькі адбыўся першы выпуск спецыялістаў па такіх новых для нас спецыяльнасцях, як замежныя мовы, класічныя мовы, псіхалогія, а таксама распачалася праца па арганізацыі новых формаў навучання. Па чатырох спецыяльнасцях быў праведзены набор студэнтаў на завочную форму навучання фізіка-тэхнічнага факультэта на падставе дагавору аб сумеснай падрыхтоўцы спецыялістаў паміж Гродзенскім дзяржаўным універсітэтам імя Янкі Купалы і Полацкім дзяржаўным універсітэтам. Асноўнай мэтай такога віду навучання з'яўляецца забеспячэнне Гродзенскага рэгіёну неабходнымі спецыялістамі па некаторых тэхнічных спецыяльнасцях.

Практыку арганізацыі інтэграванай падрыхтоўкі студэнтаў плануецца працягваць. З



**ЕСТЬ МНЕНИЕ!**

**Модрис ОЗОЛИНС, представитель Рижской бизнес-школы:**

Я хотел бы высказать наилучшие пожелания от имени Рижского технического университета и его ректора и передать вам адресную грамоту. Надеемся, что сотрудничество будет долгим и полезным!...

2000/2001 навучальнага года будзе ажыццяўляцца сумесная падрыхтоўка спецыялістаў на падставе дагавору паміж Гродзенскім дзяржаўным універсітэтам імя Янкі Купалы і Магілёўскім дзяржаўным тэхналагічным інстытутам як па дзённай, так і па завочнай формах навучання.

Плануецца адкрыць і іншыя новыя спецыяльнасці: "Фінансы і крэдыт", "Сацыяльная педагогіка", "Педагогіка і методыка пачатковага навучання" з дадатковай спецыяльнасцю "Англійская мова", "Дэфекталогія".

Адкрыццё новых спецыяльнасцей, спецыялізацый з'яўляецца часткай комплекснай праграмы забеспячэння нашага рэгіёну высокакваліфікаванымі спецыялістамі, якія запатрабаваны сённяшнім жыццём.

У 1999 годзе універсітэт упершыню сярод ВНУ рэгіёнаў узначаліў міжінстытуцкую праграму "Дынамічныя сістэмы" (навуковы кіраўнік — доктар фіз.-мат. навук, заг. кафедры, прафесар С.А.Мінюк). Распачата праца над комплексным міжінстытуцкім праектам "Моладзь як суб'ект і аб'ект сацыяльна-палітычнай трансфармацыі грамадства" (навуковы кіраўнік — доктар філасофскіх навук, заг. кафедры прафесар Ч.С.Кірвель), міжнародным праектам "Спектраскапічныя метады з выкарыстаннем тонкіх сярэбраных і залатых плёнак да біямедыцынскіх даследаванняў" (навуковы кіраўнік — доктар фіз.-мат. навук, праф. С.А.Маскевіч), міжнародным праектам "Стварэнне бізнес-магістратуры ў ГрДУ імя Янкі Купалы" сумесна з універсітэтам Бафала, Рыжскай школай бізнесу і універсітэтам Ніагара (навуковы кіраўнік — канд. эканам. навук Лі Чон Ку). Распрацавана і накіравана на экспертызу ў Дзяржаўны камітэт па навуцы і тэхналогіях рэгіянальная навукова-тэхнічная праграма. Створаны 3 навукова-даслед-



чыя лабараторыі. Распачаты і паспяхова працягваецца выпуск навукова-тэарэтычнага часопіса "Веснік Гродзенскага дзяржаўнага універсітэта імя Янкі Купалы", павышаны статус навукова-метадычнага часопіса "Альфа".

Такім чынам, за 10 апошніх гадоў ва універсітэце адбыліся значныя змены. Колькасць спецыяльнасцей павялічылася з 14 да 42 (сарака дзвюх), студэнтаў — з 5228 (пяці тысяч двухсот дваццаці васьмі) да 9360 (дзевяці тысяч трохсот шасцідзесяці ), аспірантаў — з 22 (дваццаці двух) (па 15 спецыяльнасцях) да 148 (ста сарака васьмі) (па 34 спецыяльнасцях). За гэты час абаронена 29 (дваццаць дзевяць) доктарскіх дысертацый. Фарміруюцца вядомыя ў краіне навуковыя школы прафесараў І.П.Мартынава, С.А.Мінюка, В.М.Горбузава — на матэматычным факультэце, С.В.Кандрацьевай і В.П.Таранцея — на факультэце псіхалогіі і педагогікі, С.С.Ануфрыка, Л.М.Ківача, В.А.Струка, Ю.М.Рычкова і В.А.Ліопы — на фізіка-тэхнічным факультэце, П.У.Сцяцко, С.П.Мусіенкі, І.Я.Лепешава і М.І.Канюшкевіч — на філалагічным факультэце, У.А.Баркова — на факультэце

**ЕСТЬ МНЕНИЕ!**

**В.ГАВРОН, начальник управления образования облисполкома, выпускник Гродненского пединститута:**

70 процентов педагогов области — выпускники нашей Альма-матер. Это хорошо подготовленные специалисты, высокообразованные культурные люди. Желаем и в дальнейшем нашему родному университету держать высокую марку...

# МЫ — НЕ ПОБАЧ З ЕЎРОПАЙ.



фізічнай культуры, У.Д.Разенфельда, І.П.Крэня і В.М.Чарапіцы — на факультэце гісторыі і культуры, А.І.Васкабоева і Я.П.Крамлёва — на біялагічным факультэце, І.В.Гушчына, Г.А.Зорына і М.У.Сільчанкі — на юрыдычным факультэце.

Нягледзячы на значныя поспехі кафедраў, факультэтаў і ў цэлым універсітэта ў арганізацыі навучальнага працэсу і навукі, застаецца нявырашаным шэраг праблемаў, і ў першую чаргу звязаных з матэрыяльнай базай. Па-ранейшаму востра адчуваецца недахоп аўдыторнага фонду. Нягледзячы на арганізацыю працы са студэнтамі ва ўсіх корпусах у дзве змены, усё ж каля 100 аўдыторый не хапае. Гэта праблема часткова вырашаецца праз арэнду памяшканняў і дадаткова будзе вырашацца праз рамонт і ўвядзенне ў дзеянне новых плошчаў і будаўніцтва новых корпусаў.

У станаўленне і развіццё нашай навучальнай установы ўнеслі вялізны ўклад многія супрацоўнікі. Найбольш яскравы талент педагогаў і арганізатараў адукацыі, выхавання і навукі праявілі такія вядомыя ва ўсёй рэспубліцы людзі, як Н.Д.Бяспамятных (гісторыя матэматыкі); Я.І.Рыўкінд (тэорыя функцый); Б.М.Фіх (гісторыя Беларусі); Я.Н.Мараш (гісторыя каталіцызму); Т.Ф.Сцяшковіч (філалогія); кіраўнікі ўстановы М.В.Уласавец, Д.С.Маркоўскі, А.В.Бадакоў, Л.М.Ківач і іншыя.

Сёння выпускнікі універсітэта працуюць на адказных кіруючых пасадах у дзяржаўных органах і грамадскіх арганізацыях, імі ганарацца ў працоўных калектывах нашай краіны і за яе межамі.

Якім бачыцца Гродзенскі дзяржаўны універсітэт у бліжэйшай будучыні?

Жыццё часта робіць смелыя прадказанні нежыццяздольнымі, а саміх прадказальнікаў — недарэчнымі. Таму хацелася б спыніцца на той будучыні, якая ўжо сёння акрэслена сучаснасцю. Рэальнае жыццё ўсклала на плечы нашага універсітэта адказнасць за развіццё менавіта Гродзенскага рэгіёну. Таму універсітэт заўсёды імкнуўся і будзе імкнуцца заставацца найбуйнейшым рэгіянальным цэнтрам навукі, адукацыі і культуры. Адсюль вынікае такі прыярытэтны кірунак развіцця, як узаемадзеянне з эканамічнай, сацыяльнай, інфармацыйнай інфраструктурамі горада і вобласці.

Мы заўсёды імкнуліся забяспечыць адпаведнасць навучальных праграм і тэмаў навуковых даследаванняў рэальнаму жыццю, арыентаваць выкладанне і даследаванні на рашэнне канкрэтных праблем. Але заўтра адметнай рысай універсітэта павінна стаць трывалая сувязь з практыкай і накіраванасць на рашэнне праблем вытворчасці, якія рэальна існуюць у рэгіёне. І на гэтым шляху вялікія надзеі ўскладаюцца на больш шчыльнае супрацоўніцтва з арганізацыямі і прамысловымі прадпрыемствамі горада і вобласці ў рамках бізнес-інавацыйнага цэнтра (тэхнапарка), які ствараецца ў рэгіёне.

**ЕСТЬ МНЕНИЕ!**

**Уршуля ЯЦКОВЯК, проректор университета Гданьска:**

Радуемся вместе с вами и поздравляем. Хотим наладить контакт с вами, чтобы вместе учить молодежь доброте и дружбе...

Галоўным прыярытэтам развіцця, які будзе вызначаць аблічча Гродзенскага універсітэта ў бліжэйшай будучыні, несумненна, застанецца павышэнне якасці навучальна-выхаваўчага працэсу.

Логіка зменаў, што адбываюцца ў макраасяроддзі універсітэта, патрабуе далейшай працы па гуманізацыі і гуманітарызацыі універсітэцкай адукацыі з мэтаю забяспечыць задавальненне адукацыйных і духоўных патрэб асобы, пашыраючы для яе магчымасць больш глыбокага пранікнення ў сферу спецыяльных ведаў. Такі падыход патрабуе вывучэння і паўсюднага ўкаранення сучасных адукацыйных тэхналогій, у тым ліку (а можа, і ў першую чаргу) камп'ютарных, мультымедыйных, аўдыё-візуальных.





Разумеючы, што ад якасці адукацыі залежыць яе далейшы поспех, універсітэт павінен пастаянна кантраляваць і ўносіць неабходныя змены ў наяўныя адукацыйныя стандарты.

Павышэнне якасці навучальна-выхаваўчага працэсу залежыць не толькі ад якасці выкладання, але і ад якасці ўспрымання ведаў студэнтамі, на што ўплываюць і ўмовы, у якіх яны вучацца і жывуць. Таму універсітэт будучыні немагчымы без развітых студэнцкіх службаў, прафсаюза студэнтаў, аддзела па выхаваўчай працы, псіхалагічнай службы універсітэта, якія павінны рашаць мноства праблем. Гэта такія, як дапамога ў развіцці навыкаў навучання, развіццё камунікацыі паміж студэнтамі і адміністрацыяй, студэнтамі і прафесарска-выкладчыцкім складам, сістэма студэнцкага харчавання і іншыя паслугі, выхаваўчая і пазааўдыторная праца, праблемы студэнцкіх інтэрнатаў і г.д.

Універсітэт будзе ў рамках сваёй місіі і мэтаў актывізаваць пазабюджэтную дзейнасць, прыцягваючы рэсурсы з недзяржаўных крыніц. Далейшае развіццё атрымаюць платная адукацыя, адукацыйныя паслугі ў межах неперарыўнай адукацыі, гаспадарча-разліковыя даследаванні, платныя формы магістратуры і аспірантуры, кансультацыйныя і экспертныя паслугі, а таксама паслугі, звязаныя з эксплуатацыяй асноўных сродкаў універсітэта.

Адной з істотных крыніц знешніх рэсурсаў універсітэта з'яўляюцца міжнародныя фонды і праграмы. Універсітэт ужо набыў пэўны вопыт удзелу ў розных міжнародных даследчых і адукацыйных праграмах і праектах і ў будучым будзе нарошчваць свой удзел у падобнага роду дзейнасці.

Усе вышэйпералічаныя кірункі патрабуюць значнай працы па аптымізацыі універсітэцкіх структур, сістэмы кіравання.

# МЫ — У ЯЕ ЦЭНТРЫ



Узгаданыя і іншыя кірункі працы, якія немагчыма пералічыць у гэты сапраўды святочны час, прафесарска-выкладчыцкі калектыў і супрацоўнікі універсітэта будуць здзяйсняць самааддана, добрасумленна, з пачуццём адказнасці перад дзяржавай і ўдзячнасці народу.

Шчыра віншую з нашым святам ветэранаў, выкладчыкаў і студэнтаў, увесь калектыў! Жадаю новых творчых поспехаў у працы, моцнага здароўя, дабрабыту і шчасця ў асабістым жыцці. Няхай наша праца і надалей плённа служыць высакароднай мэце — несці святло людзям.

Пасля дакладу рэктара з кароткімі выступленнямі падымаліся на сцэну Леанід Мікалаевіч Ківач, Лідзія Уладзіміраўна Кірылюк, Марыя Іосіфаўна Канюшкевіч, студэнт юрфака Ігар Плышэўскі. Затым начальнік навучальнага аддзела П.Л. Навіцкі зачытаў святочны загад рэктара аб заахвочванні выкладчыкаў і супрацоўнікаў універсітэта. Вялікая група іх узнагароджана Ганаровымі граматамі. Гэтыя супрацоўнікі



атрымаюць таксама грашовыя прэміі. Яшчэ адной групе выкладчыкаў і супрацоўнікаў аб'яўлена падзяка.

Затым пачаліся выступленні гасцей, якія віншавалі з юбілеем, дарылі падарункі. Ажыўленне ў зале выклікаў падарунак прафесара Джона Томаса з універсітэта Бафала (ЗША). Ён апрануў нашага рэктара ў доктарскую мантыю.

Выступілі ўсе прадстаўнікі замежных дэлегацый. Генеральны консул Рэспублікі Польшча ў Гродне пан Шостак павіншаваў з юбілеем ад імя сваёй краіны.

Затым з віншаваннямі выступілі выпускнікі універсітэта, кіраўнікі прадпрыемстваў, грамадскіх арганізацый, аблвыканкома, гарадскога выканаўчага камітэта. Адчувалася, што кожны мае дачыненне да універсітэта, што 60-гадовы юбілей ВНУ — свята ўсяго рэгіёну.

* * *

Праграма мерапрыемстваў на 4 сакавіка ўключала спартыўную і культурную праграму і ўрачыстае пасяджэнне. Раніцай, у 10 гадзін, выкладчыкі, супрацоўнікі, студэнты і выпускнікі універсітэта і госці ў Лядовым палацы спорту паглядзелі канцэнт артыстаў беларускай эстрады ў суправаджэнні аркестра заслужанага дзеяча культуры Міхаіла Фінберга. А ў спартыўнай зале галоўнага корпуса універсітэта прайшла матчавая сустрэча па грэка-рымскай барацьбе.

У другой палове дня для гасцей была арганізавана прэзентацыя універсітэта з аглядам выставы, а потым у актавай зале галоўнага корпуса адбыўся ўрачысты сход з удзелам прадстаўнікоў Адміністрацыі Прэзідэнта, Савета Міністраў, міністэрства адукацыі, вобласці, горада.

З прывітаннем ад Адміністрацыі Прэзідэнта выступіў выпускнік Гродзенскага пед-



інстытута, першы намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Уладзімір Васільевіч Русакевіч. Міністр адукацыі Рэспублікі Беларусь Васіль Іванавіч Стражаў зачытаў прывітанні ад імя ўрада і ад імя Міністэрства адукацыі, а таксама ўручыў Ганаровыя граматы і знакі «Выдатнік адукацыі» выкладчыкам ГрДУ. Яшчэ адной групе выкладчыкаў уручаны Ганаровыя граматы і прысуджаны грашовыя прэміі. Затым выступілі старшыня Гродзен-



скага аблвыканкома А.І.Дубко, старшыня абласнога Савета народных дэпутатаў П.І.Карпуць, старшыня камітэта па справах рэлігіі і нацыянальнасцей А.Н.Білык. Кожны разам з цёплымі словамі віншавання абвяшчаў і аб канкрэтнай справе — грашовай прэміі, падарунку. Выступіў таксама прафесар Адам Ямрозь з універсітэта Беластока. Пасля прывітальных слоў ён расказаў аб тым, што раніцай была падпісана з рэктарам ГрДУ дамова аб супрацоўніцтве.

З віншаваннямі выступілі: начальнік камітэта па навуцы і тэхналогіях В.І.Пракошын, старшыня Гродзенскага выканкома А.М.Пашкевіч, старшыня гарсавета дэпутатаў Ф.П.Гудзей, кіраўнікі гарадскіх і раённых адміністрацый Гродна, Ліды, Ваўкавыска, кіраўнікі дэлегацый, прадстаўнікі вайскоўцаў, калегі, навукоўцы з іншых ВНУ рэспублікі.

Вялікай групе выкладчыкаў і супрацоўнікаў універсітэта былі ўручаны Ганаровыя граматы, лісты ўдзячнасці.

Вечарына закончылася канцэртам мастацкай самадзейнасці студэнтаў універсітэта.



**ЕСТЬ МНЕНИЕ!**

**А.ГРИНЬ, председатель профкома студентов:**

Из мероприятий для молодежи больше всего впечатляет концерт в Ледовом дворце спорта. У студентов остались очень хорошие воспоминания, получен эмоциональный заряд. Да и в целом празднование сблизило студентов и преподавателей. Неплохо бы каждый год отмечать день университета. Это помогает жить, учиться, знать свою историю и ценить настоящее...

# СПОРТИВНЫЙ КАЛЕЙДОСКОП

РУБРИКУ ВЕДЕТ СТАРШИЙ ПРЕПОДАВАТЕЛЬ КАФЕДРЫ ФИЗВОСПИТАНИЯ О. СМОЛЯКОВ

## «ГРЕКО-РИМЛЯНЕ» - МОЛОДЦЫ!



В программе празднования 60-летия университета была товарищеская встреча по греко-римской борьбе между сборной командой Республики Беларусь и сборной командой университета.

На соревнованиях присутствовали работники министерств народного образования и спорта и туризма, ректоры ВУЗов РБ, Белостока. Среди почетных гостей были олимпийские чемпионы, выпускники университета Е.Волчецкая и А.Курлович.

Торжественно прошел ритуал открытия соревнований. Были исполнены гимны РБ и университета. С приветственным словом выступил ректор университета, профессор С.А.Маскевич. Затем начались поединки на ковре. В первых трех поединках уверенные победы одержали выступавшие за университет чемпионы РБ Борис Радкевич (вес 54 кг) над серебряным призером Олимпиады-96 Александром Павловым, Юрий Храбров (вес 58 кг) — над серебряным призером чемпионата Европы, минчанином Александром Лабуном; Эдуард Аплевич (вес 63 кг), недавно завоевавший лицензию на Олимпиаду в Сидней, над мастером спорта, минчанином Андреем Сташонком. Затем победы праздновали представители сборной РБ: победитель международного турнира памяти Ивана Поддубного Андрей Лисица (вес 69 кг) победил Сергея Кебикова; чемпион мира среди молодежи Александр Шишко (вес 76 кг) победил Андрея Лира, а Владимир Бакуревич (университет) уступил минчанину Виталию Салюку (вес 85 кг). В весе 97 кг университет представлял чемпион мира среди студентов Александр Сидоренко. Он уверенную победу одержал над призером чемпионата Европы среди молодежи Павлом Гуменюком.

Победа в весе 130 кг была присуждена Дмитрию Конюху (университет).

В итоге командную победу со счетом 5:3 одержали борцы нашего университета.

Огорчили наши волейболисты, проигравшие сборной РБ со счетом 0:3.

В турнире по мини-футболу, где участвовали команды колледжа из Белостока, сельскохозяйственного института, Института современных знаний и университета, победу праздновала дружина Института современных знаний, сумевшая победить ГрГУ — 4:3, СХИ — 3:1, колледж — 5:2, на втором месте команда университета, на третьем — ГСХИ.

## СПАРТАКИАДА «ЗДОРОВЬЕ»

В университетской спартакиаде «Здоровье» принимают участие команды факультетов, в состав которых входят преподаватели и сотрудники ВУЗа.

Более подготовленными по шахматам выглядели команды: филологического факультета, которая обыграла физтеховцев — 4:0, юристов — 3:1, математиков — $2^{1/2}:1^{1/2}$ очка и завоевала I место. Вот кто привел команду к победе: А.В.Никитевич, В.П.Михайлов, В.К.Церлюкевич и И.В.Груль. Второе место завоевали математики (капитан команды В.Ю.Тищенко), на третьем — юристы, на четвертом месте — команда физтеха.

Победителями на первой доске стали А.В.Никитевич и В.Ю.Тищенко, на второй доске — В.П.Михайлов, на третьей — В.К.Церлюкевич, на четвертой — А.А.Кудель.

В первенстве по мини-футболу, которое проходило в манеже ФФК, за победу боролись шесть сборных факультетов. Основная борьба за призовые места велась между тремя командами (юрфак, ФФК и матфак).

Эти три коллектива финишировали с 12 очками, одержав по четыре победы и одно поражение. Победитель определился по лучшей разнице забитых и пропущенных мячей. Им оказалась команда юрфака, выступавшая в составе: А.Кебец (капитан команды), А.Кудель, С.Клочко, В.Калюта, В.Макаревич, В.Малько.

Вторую ступень пьедестала заняли математики, третью — факультет физической культуры. Далее места распределились в следующем порядке: факультет экономики и управления, психологии и педагогики и физтех.

В первенстве по волейболу также шесть команд боролись за победу. Это команды факультета физической культуры, администрации ВУЗа, юристы, физтех, филологи и факультет экономики и управления.

Команда факультета физической культуры, ведомая деканом А.И.Навойчиком, нанесла поражение всем командам с одинаковым счетом 2:0 и завоевала I место. В команде играли кроме декана, В.С.Лещук, С.А.Кошар, С.К.Кирилов, Ю.Н.Чудаков, М.Лис и О.Кузнецова, на втором месте — дружина юридического факультета, на третьем — филологический факультет. Далее идут команды факультета экономики и управления, физико-технический факультет и команда администрации ВУЗа.

## ВЫРАЖАЕМ БЛАГОДАРНОСТЬ

**За большой личный вклад в комплектование библиотечного фонда и передачу в дар университету около 2000 экз. научной и учебной литературы кафедра теоретической физики и научная библиотека университета выражают сердечную благодарность доценту кафедры теоретической физики, кандидату физико-математических наук Анатолию Павловичу Семашко.**

***У прафсаюзных камітэтах***

## КАНФЕРЭНЦЫЯ працоўнага калектыву

Адбылася чарговая канферэнцыя працоўнага калектыву. Пачалася яна з прыемнага — уручэння Ганаровых грамат выкладчыкам і супрацоўнікам універсітэта, узнагароджаным у сувязі з 60-годдзем універсітэта.

З дакладам аб выніках выканання калектыўнага дагавору ў 1999 г. і ўнясенні змяненняў у яго ў 2000 годзе выступіў старшыня прафкома выкладчыкаў і супрацоўнікаў універсітэта Ул.А.Хілюта.

— Склалася добрая практыка дэмакратычнага прынцыпа рашэнняў, — сказаў Уладзімір Андрэевіч. — За справаздачны перыяд зроблена многае з таго, што меркавалася. Да прыкладу, на 90 працэнтаў створана нарматыўна-прававая база. Была прынята сацыяльная праграма абароны студэнтаў і супрацоўнікаў. З боку адміністрацыі выдаткоўваліся сродкі на сацыяльныя патрэбы. Не было затрымак выдачы заработнай платы, паспяхова ажыццяўляецца праграма «Жыллё». У 1999 годзе 19 супрацоўнікаў уключаны ў ЖБК і долевае будаўніцтва...

Пасля дакладу старшыні прафкома Ул.А.Хілюты слова ўзяў рэктар ГрДУ, прафесар С.А.Маскевіч. Ён спыніўся на асноўных напрамках дзейнасці універсітэта і задачах па іх ажыццяўленні.

З інфармацыяй выступіла галоўны бухгалтар універсітэта Т.М.Завадская.

Затым было абмеркавана Палажэнне аб матэрыяльнай дапамозе.

Пасля абмену думкамі па гэтых напрамках былі разгледжаны іншыя пытанні.

## ИНТЕЛЛЕКТ ГОРОДА

Уже шестой раз подряд отдел по работе с молодежью горисполкома проводил конкурс среди молодежи и студенчества по номинациям: ученик города, студент города, молодой талант города, молодой рабочий города. Нынче появилась еще одна номинация: интеллект города. Недавно подведены итоги, в результате которых двое наших студентов за заслуги в научной среде стали победителями. Звание «Интеллект города» присвоено студенту 5 курса отделения психологии Константину Карпинскому и студенту 4 курса юридического факультета Игорю Плышевскому.

Победители конкурса отмечены дипломами, им вручены премии.

**А.ГРИНЬ,**
**председатель профкома студентов.**


*Рэдактар* **Людміла Мікалаеўна ДАНІЛАВА**

*Заснавальнік: Гродзенскі дзяржаўны універсітэт імя Янкі Купалы.*
Рэгістрацыйнае пасведчанне № 519.

Газета набрана, звярстана і надрукавана на тэхніцы выдавецкага аддзела Гродзенскага дзяржаўнага універсітэта імя Янкі Купалы. ЛП № 111 ад 29.12.97 г.
Вул. Ажэшкі, 22, 230023, г. Гродна.

*Набор і вёрстка:* **М. ВЕРСТАК, В. ЗАКРЭЎСКІ.**
*Фота:* **Ул.САРОКІН.**
*Карэктура:* **Н. ДУДКО.**

*Здадзена ў набор 16.03.2000.*
*Падпісана да друку: 23.03.2000. 15.00*
*Заказ №94*

Аб'ём — 1 ум. друк. арк.
Наклад 500 асобнікаў.



Аўтары надрукаваных матэрыялаў адказваюць за падбор і дакладнасць прыведзеных фактаў, цытатаў, эканамічных даных, асабістых імёнаў, геаграфічных назваў і іншай інфармацыі, а таксама за тое, каб у матэрыялах не ўтрымлівалася даных, якія не падлягаюць адкрытай публікацыі. Рэдакцыя можа друкаваць артыкулы ў парадку абмеркавання, не падзяляючы пункту гледжання аўтара.



*Наш адрас: 230023, г.Гродна, вул. Ажэшкі, 22, пакой 228. ☎ 72-08-17.*